БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 069(476)(091)(043.3)+008(476)(091)(043.3)

ФІЛІПЧЫК
Дзяніс Уладзіміравіч

# НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА Ў ДЗЯРЖАЎНЫХ МУЗЕЯХ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (1991–2016 гг.)

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 24.00.03 – музеязнаўства, кансервацыя
і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб’ектаў

Мінск, 2020

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік – **Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Афіцыйныя апаненты: **Гайдукевіч Леанід Міхайлавіч**, доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры міжнароднага турызму Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;

**Герасімёнак Дзмітрый Васільевіч,** кандыдат культуралогіі, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Апаніруючая арганізацыя – **УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»**

Абарона адбудзецца «14» мая 2020 г. у 14.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8 (корпус юрыдычнага факультэта), аўд. 407.

Тэлефон вучонага сакратара: 209-55-58; e-mail: huzhalouski@gmail.com.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «31» сакавіка 2020 г.

В.а. вучонага сакратара
савета па абароне дысертацый І. А. Еўтух

# УВОДЗІНЫ

У выніку працэсаў мадэрнізацыі і трансфармацыі, якія зведала ў ХХ ст. беларускае грамадства, традыцыйная культура, а разам з ёй і нематэрыяльныя яе праяўленні, пачалі відазмяняцца і з цягам часу знікаць. Адпаведна ўзнікла неабходнасць дакументавання, вывучэння, інтэрпрэтацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей НКС) Рэспублікі Беларусь.

Вынікам намаганняў міжнароднай супольнасці, скіраваных на захаванне НКС, стала прыняцце Канвенцыі ЮНЭСКА 2003 г. «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны» (далей Канвенцыя 2003 г.). На 2019 г. Канвенцыя 2003 г. была прызнана міжнароднай супольнасцю, аб чым сведчыць тое, што яна ратыфікавана ў 178 краінах. Рэспубліка Беларусь была сярод першых дзесяці краін свету, якія ратыфікавалі дадзены дакумент[1]. Паводле Канвенцыя 2003 г. да НКС адносяцца «звычаі, формы прадстаўлення і ўяўлення, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, якія прызнаюцца супольнасцямі, групамі і ў некаторых выпадках асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны»[2].

Нематэрыяльная спадчына стагоддзямі ўплывала на фарміраванне светапогляду і ідэнтычнасці беларускага народа, на шматлікія сферы жыцця грамадства. У гэтай спадчыне ўвасоблены надзвычай важныя культурныя асаблівасці, якія вылучаюць беларускую культуру сярод астатніх. Таму вельмі востра паўстае пытанне захавання, трансляцыі і перадачы НКС будучым пакаленням.

Актуальнасць тэмы даследавання абумоўлена тым, што ў справу захавання і інтэрпрэтацыі НКС усё больш актыўна ўключаюцца дзяржаўныя музеі Рэспублікі Беларусь. Уключэнне НКС у поле музейнай дзейнасці спрыяе не толькі захаванню нематэрыяльнай спадчыны, але і ўзбагачае музеі новымі формамі культурна-адукацыйнай работы, нетыповымі выставачнымі і экспазіцыйнымі праектамі, што прыводзіць да павышэння турыстычнай атрактыўнасці як асобных музеяў, так і цэлых рэгіёнаў. Гэта ў сваю чаргу спрыяе павышэнню колькасці наведванняў музеяў, атрыманню эканамічнага эфекту ад турызму, актуалізацыі нематэрыяльнай спадчыны і, у выніку, устойліваму развіццю рэгіёнаў. Таму ўзнікае неабходнасць вывучэння ролі і

---

[1] Official list in chronological order [Electronic resource // Official website of The Intangible Cultural Heritage] – Mode of access: http://www.unesco.org/eri/la/convention.asp?KO=17116&language=E. – Date of access: 10.03.2019.

[2] Basic texts of the 2003 Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage. – Paris : UNESCO, 2011. – P. 12.

месца музеяў у гэтых працэсах, накірункаў і шляхоў дакументавання музеямі нематэрыяльнай спадчыны, спосабаў прадстаўлення элементаў НКС у экспазіцыйна-выставачнай прасторы, найбольш эфектыўных форм культурна-адукацыйнай работы з НКС. Вывучэння патрабуюць і пытанні ўзаемадзеяння музеяў з носьбітамі традыцыі, лакальнымі супольнасцямі, этычныя прынцыпы ў сферы захавання НКС. Даследаванне гэтых пытанняў дазволіла атрымаць вынікі, якія могуць быць запатрабаваны не толькі з боку навуковай супольнасці, але і мець практычнае прымяненне ў музейнай і турыстычнай сферах.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі, праектамі і тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне падрыхтавана ў адпаведнасці з НДР «Этнакультурная спадчына: праблемы захавання і выкарыстання ў Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20161820), якая выконваецца ў рамках ДПНД «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг. (падпраграма «Гісторыя і культура»), зацверджанай пастановай Савета Міністраў РБ ад 10.06.2015 г. №483.

### Мэта і задачы даследавання

**Мэта** дысертацыйнага даследавання – выявіць сутнасць і змест дзейнасці дзяржаўных музеяў Рэспублікі Беларусь па дакументаванні, вывучэнні, інтэрпрэтацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991–2016 гг.

Мэта даследавання вызначыла кола даследчых **задач**:

- выявіць асаблівасці музейнага дакументавання НКС;
- раскрыць значэнне музейнага вывучэння НКС для яе захавання;
- вызначыць тэндэнцыі прадстаўлення НКС у стацыянарных музейных экспазіцыях;
- ахарактарызаваць асаблівасці прадстаўлення НКС на музейных выстаўках;
- выявіць найбольш эфектыўныя для захавання НКС формы культурна-адукацыйнай работы музеяў;
- паказаць магчымасці папулярызацыі НКС у культурна-адукацыйнай рабоце музеяў.

**Аб’ект даследавання** – нематэрыяльная культурная спадчына.

**Прадмет даследавання** – дакументаванне, вывучэнне, інтэрпрэтацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны дзяржаўнымі музеямі Рэспублікі Беларусь.

Выбар аб’екта і прадмета даследавання абумоўлены неабходнасцю комплексна даследаваць уклад беларускіх музеяў у справу дакументавання, вывучэння, інтэрпрэтацыі НКС. Беларускімі даследчыкамі дадзеная праблема не разглядалася сістэматычна, а вывучэнне асобных бакоў праблемы насіла эпізадычны характар.

Храналагічныя межы даследавання ахопліваюць перыяд з 1991 г. па 2016 г. Выбар ніжняй храналагічнай мяжы даследавання абгрунтаваны набыццём Рэспублікай Беларусь у 1991 г. дзяржаўнага суверэнітэту і пачаткам новага этапа ў дзяржаўным і культурным будаўніцтве. У даследаванні аналізуецца і абагульняецца дваццаціпяцігадовы вопыт работы айчынных музеяў з НКС. Верхняя храналагічная мяжа даследавання абумоўлена пачаткам новага этапа ў культурнай палітыцы дзяржавы з прыняццем у 2016 г. Кодэкса Рэспублікі Беларусь Аб культуры і яго ўступленнем у сілу ў 2017 г.

Геаграфічныя межы даследавання супадаюць з дзяржаўнымі межамі Рэспублікі Беларусь.

**Навуковая навізна**

Навуковая навізна заключаецца ў комплексным і сістэмным даследаванні праблемы. Упершыню былі вызначаны асаблівасці музейнага дакументавання нематэрыяльнай спадчыны. Вылучаны этапы ў музейным вывучэнні НКС, паказана значнасць навукова-даследчай дзейнасці музеяў для захавання нематэрыяльнай спадчыны.

Вызначаны тэндэнцыі прадстаўлення НКС у экспазіцыйна-выставачнай прасторы. Паказаны асаблівасці адлюстравання ў экспазіцыі рамёстваў і промыслаў, спосабы іх прадстаўлення, якія эфектыўны з пункту гледжання захавання НКС. Выдзелены метад пабудовы экспазіцыі, які дазваляе адлюстроўваць усе вобласці нематэрыяльнай спадчыны.

У дысертацыйным даследаванні комплексна прааналізавана культурна-адукцыйная дзейнасць музеяў у сферы нематэрыяльнай спадчыны. На падставе навуковага аналізу вылучаны найбольш эфектыўныя з пункту гледжання захавання НКС формы культурна-адукацыйнай работы музеяў.

Дадзеная работа дазваляе пашырыць навуковыя ўяўленні пра ролю дзяржаўных музеяў Рэспублікі Беларусь у захаванні і інтэрпрэтацыі НКС.

**Палажэнні, вынесеныя на абарону**

1. Асаблівасць музейнага дакументавання нематэрыяльнай спадчыны заключалася ў тым, што музеі ў першую чаргу арыентаваліся на збор і

захаванне прадметаў, звязаных з НКС, а не самой нематэрыяльнай спадчыны, разглядалі яе ў якасці кантэкстнай інфармацыі. Папаўненне фондаў музея такімі прадметамі спрыяла далейшаму вывучэнню нематэрыяльнай спадчыны, прадстаўленню яе ў музейнай экспазіцыі, на тэматычных выстаўках, выкарыстанню ў культурна-адукацыйнай дзейнасці. У працэс музейнага дакументавання НКС недастаткова былі ўключаны носьбіты нематэрыяльнай спадчыны, лакальныя супольнасці. Найбольш актыўна дакументаваннем НКС музеі займаліся падчас правядзення экспедыцый. У большасці выпадкаў музейныя экспедыцыі праходзілі ў выглядзе аднадзённых выездаў па населеных пунктах раёна, толькі некаторыя музеі рэалізоўвалі буйныя і доўгатэрміновыя даследчыя праграмы.

2. У вывучэнні НКС музеямі Рэспублікі Беларусь вылучаецца два этапы: 1) 1991–2005 гг. і 2) 2006–2016 гг. Першы этап характарызаваўся вывучэннем музейных калекцый, звязаных з НКС, і самой НКС у межах этнаграфічных даследаванняў музеяў. У выніку гэтага большасць музейных публікацый была прысвечана традыцыйным рамёствам і цырымоніям. Другі этап характарызаваўся новым тэарэтыка-метадалагічным узроўнем даследаванняў, большай увагай да ролі музеяў у захаванні і інтэрпрэтацыі НКС, да праблем актуалізацыі, падтрымання жыццяздольнасці НКС. Музеі ў разглядаемы перыяд выступалі ў якасці арганізатараў навукова-практычных канферэнцый, якія прыцягвалі ўвагу да НКС не толькі музейных супрацоўнікаў, але і акадэмічных спецыялістаў, што спрыяла ўсебаковаму, комплекснаму вывучэнню нематэрыяльнай спадчыны. У выніку музейныя даследаванні сталі адной з мер па захаванні нематэрыяльнай спадчыны.

3. Для стацыянарных экспазіцый музеяў характэрна тэндэнцыя да адлюстравання традыцыйных рамёстваў і промыслаў пры ігнараванні іншых абласцей НКС. Гэта абумоўлена магчымасцю праз дэманстрацыю сыравіны, інструментаў, фотаздымкаў працэсу і гатовых вырабаў адлюстраваць тое ці іншае рамяство. Найбольш эфектыўным з пункту гледжання захавання нематэрыяльнай спадчыны варыянтам прадстаўлення рамёстваў была арганізацыя дзеючых рамесных майстэрняў, што дазваляла наведвальнікам убачыць аўтэнтычную тэхналогію і носьбіта-майстра. Значная частка музеяў абмежавалася прадстаўленнем у стацыянарнай экспазіцыі побыту, сельскагаспадарчых заняткаў. Такія экспазіцыі характарызаваліся аднатыпнасцю рашэнняў, спрошчаным прадстаўленнем НКС, дзе яна выступала ў ролі кантэкстнай інфармацыі аб музейным прадмеце. У параўнанні з іншымі метадамі праектавання экспазіцыі сюжэтна-вобразны метад паказаў найбольшыя магчымасці для комплекснага адлюстравання нематэрыяльнай

спадчыны. Уключэнне НКС у экспазіцыю музея дазваляла стварыць унікальную, пазнавальную, атрактыўную экспазіцыйна-выставачную прастору.

4. У параўнанні з прадстаўленнем НКС у стацыянарных музейных экспазіцыях паказ нематэрыяльнай спадчыны на выстаўках адрозніваўся большай разнастайнасцю тэм, варыятыўнасцю ў спосабах прадстаўлення дадзенай спадчыны. Праз падрыхтоўку і паказ выставак музеі актыўна ўдзельнічалі ў святах, фестывалях, конкурсах, іншых мерапрыемствах па-за музеем. Гэта садзейнічала папулярызацыі НКС, паказвала ўключанасць музеяў у працэс захавання нематэрыяльнай спадчыны. Музейныя выстаўкі дазвалялі прадстаўляць НКС на рэгіянальным, рэспубліканскім і міжнародным узроўнях. На рэгіянальным узроўні выстаўкі былі, як правіла, скіраваны на папулярызацыю НКС сярод яе носьбітаў, усведамленне імі важнасці гэтай спадчыны. На рэспубліканскім і міжнародным узроўні выстаўкі, прысвечаныя НКС, прадстаўлялі багацце нацыянальных традыцый, адыгрывалі рэпрэзентатыўную функцыю.

5. Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь перш за ўсё спрыяла захаванню НКС. Сярод форм культурна-адукацыйнай работы, накіраваных на захаванне нематэрыяльнай спадчыны найбольш эфектыўнымі былі музейна-педагагічныя заняткі (цыклы заняткаў, адукацыйныя праграмы), майстар-класы, музейныя аб’яднанні (клубы, гурткі). Менавіта праз рэалізацыю гэтых форм культурна-адукацыйнай работы музеі спрыялі трансляцыі НКС новым носьбітам, забеспячэнню непарыўнасці практыкі перадачы нематэрыяльнай спадчыны і, адпаведна, яе жыццяздольнасці. Максімальнага эфекту ў захаванні НКС музеі дасягалі ў выпадку распрацоўкі і рэалізацыі доўгатэрміновых музейна-педагагічных праграм або цыклаў заняткаў па адной тэме. Яны дазвалялі комплексна і паслядоўна ўдзельнікам засвоіць агульныя веды аб традыцыйнай культуры, яе мясцовыя асаблівасці, усвядоміць важнасць НКС і стаць яе носьбітамі. Майстар-класы часцей за ўсё выкарыстоўваліся разам з іншымі формамі культурна-адукацыйнай работы, але маглі праводзіцца і самастойна. Важнай для захавання НКС з’яўлялася дзейнасць музейных аб’яднанняў. Музейныя аб’яднанні дазвалялі на практыцы пры рабоце з нематэрыяльнай спадчынай рэалізоўваць парадыгму ўдзелу, праз уключэнне ў захаванне НКС носьбітаў, лакальных супольнасцей, музейных спецыялістаў і ўсіх зацікаўленых асоб.

6. Сярод форм культурна-адукацыйнай работы музеяў Рэспублікі Беларусь, скіраваных на папулярызацыю НКС, выкарыстоўваліся: тэматычныя экскурсіі, лекцыі, тэатралізаваныя экскурсіі, віктарыны, сустрэчы з носьбітамі традыцыі, рэканструкцыі абрадаў або іх частак, музейныя святы (фестывалі),

гульні (на падставе народных), квэсты і інш. У дадзеным выпадку культурна-адукацыйная дзейнасць з'яўлялася сродкам павышэння асвядомленасці аб нематэрыяльнай спадчыне, павелічэння цікавасці да яе, росту павагі да НКС. Музейныя святы і фестывалі былі, як правіла, самымі масавымі мерапрыемствамі, скіраванымі на папулярызацыю НКС. Музеі станавіліся месцам правядзення такіх фестываляў, выступалі ў якасці ўдзельнікаў, рэалізоўвалі трансгранічныя праекты. Працэс камунікацыі паміж музейнымі спецыялістамі, мясцовай супольнасцю і музейнай аўдыторыяй у межах работы з НКС найбольш інтэнсіўна ішоў там, дзе адбывалася супрацоўніцтва музея з іншымі ўстановамі культуры (дамамі і цэнтрамі рамёстваў, дамамі культуры, бібліятэкамі), установамі адукацыі (дзіцячымі садкамі, школамі, ВНУ), фальклорнымі калектывамі.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем і змяшчае вынікі, атрыманыя на падставе навуковага аналізу. Саіскальнікам вызначаны асаблівасці дакументавання НКС музеямі, ахарактарызаваны тэндэнцыі інтэрпрэтацыі НКС у экспазіцыйна-выставачнай прасторы музеяў, вылучаны формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея, якія спрыялі захаванню нематэрыяльнай спадчыны, вызначаны магчымасці папулярызацыі НКС у культурна-адукацыйнай рабоце музеяў.

Саіскальнікам выяўлены, апісаны і даследаваны раней невядомы навуковай супольнасці элемент НКС, а менавіта абрад жыхароў в. Папшычы Глыбоцкага раёна «Насіць намётку». Саіскальнікам запоўнена намінацыйная форма і падрыхтаваны неабходныя матэрыялы, па выніках разгляду якіх Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, абрад «Насіць намётку» пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 02.08.2016 № 607 быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Саіскальнікам сабраны, сістэматызаваны, апрацаваны ўнікальны фактычны матэрыял, які адлюстроўвае дзейнасць 78 музейных устаноў Рэспублікі Беларусь па ахове і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991–2016 гг.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Асноўныя палажэнні даследавання адлюстраваны ў публікацыях і выступленнях на навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, у тым ліку VIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» (Мінск, Міністэрства культуры

Рэспубліकі Беларусь, БДУКіМ, 25–27 красавіка 2014 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Этнас і культура: развіццё і ўзаемадзеянне» (Мінск, БДУ, Гістарычны фак., Каф. этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, 9–10 чэрвеня 2016 г.), II Навукова-практычнай канферэнцыі «Божае Нараджэнне як феномен агульначалавечай культуры» (Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава, Віцебская дыяцэзія Рымска-каталіцкага касцёла ў Рэспубліцы Беларусь, 17 снежня 2016 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Проблемы истории и культуры пограничья: гуманитарное знание и вызовы времени» (Верхнядзвінск, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Верхнядзвінскі раённы выканаўчы камітэт, ДУК «Верхнядзвінскі гісторыка-краязнаўчы музей», 16 чэрвеня 2017 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Музей і культурная спадчына: гісторыя, сучаснасць, погляд у будучыню» (Мінск, БДУ, Гістарычны фак., Каф. этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, 27–28 чэрвеня 2017 г.), XII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» (Мінск, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, БДУКіМ, 27–29 красавіка 2018 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Современная туристическая индустрия: актуальные проблемы и перспективы развития» (Мінск, БДУ, Гістарычны фак., 24–25 мая 2018 г.), Міжнародная навуковая канферэнцыя «Роль университетского образования и науки в современном обществе» (Мінск, БДУ, 26–27 лютага 2019 г.), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Музеи в XXI веке: новые смыслы, новое пространство, новые образы» (Мінск, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Беларускі камітэт Міжнароднага Савета музеяў «ICOM», 9–10 красавіка 2019 г.), IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Национальные культуры в межкультурной коммуникации (Новая парадигма охраны культурного и природного наследия)» (Мінск, БДУ, 11–12 красавіка 2019 г.), III Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Этналогія: традыцыі і сучаснасць» (Мінск, БНТУ, 11–12 красавіка 2019 г.), XIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» (Мінск, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, БДУКіМ, 26–28 красавіка 2019 г.).

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі даследавання адлюстраваны ў 17 навуковых работах (7,3 а.а.). З іх артыкулаў у навуковых выданнях у адпаведнасці з п.18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь – 6 (3,9 а.а.), артыкулаў у іншых навуковых выданнях – 1,

артыкулаў у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый – 9, тэзісаў выступленняў на навуковых канферэнцыях – 1.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, дадаткаў. Аб'ём тэкставай часткі дысертацыі – 145 старонак, агульны аб'ём – 204 старонкі. Бібліяграфічны спіс утрымлівае 493 найменні, сярод якіх 17 – публікацыі аўтара.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У першай главе **«Гістарыяграфія, крыніцы, метады даследавання»,** якая складаецца з трох раздзелаў, раскрываецца ступень навуковай распрацаванасці тэмы, аналізуецца рэпрэзентатыўнасць выкарыстаных крыніц, характарызуюцца метадалогія і метады даследавання.

У раздзеле 1.1 *Гістарыяграфія* паказана, што пытанні дакументавання, вывучэння, інтэрпрэтацыі НКС музеямі Рэспублікі Беларусь знайшлі толькі фрагментарнае адлюстраванне ў гістарыяграфіі.

Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы аўтара былі сфарміраваны пад уплывам работ А. А. Гужалоўскага, Т. А. Джумантаевай, М. Е. Каўлен, А. М. Масцяніцы, Т. П. Палякова, Л. М. Шляхцінай, Т. Ю. Юрэневай.

Увесь масіў навуковых публікацый, звязаных з тэмай даследавання, магчыма сістэматызаваць, вылучыўшы тры групы. Гэта *айчынная гістарыяграфія, расійская гістарыяграфія, замежная гістарыяграфія*. Трэба зазначыць, што толькі ў айчыннай гістарыяграфіі непасрэдна разгледжана праблема дакументавання, вывучэння, інтэрпрэтацыі НКС музеямі Рэспублікі Беларусь. У расійскай і замежнай гістарыяграфіі даследчыкі закраналі фундаментальныя праблемы ўзаемадзеяння музея з нематэрыяльнай спадчынай: прынцыпы музейнага дакументавання НКС, узаемадзеяння з лакальнымі супольнасцямі і носьбітамі, магчымасці адлюстравання нематэрыяльнай спадчыны ў музейнай экспазіцыі, музейна-педагагічныя праекты ў галіне НКС і інш.

У *айчыннай гістарыяграфіі* праблемы дакументавання і інтэрпрэтацыі музеямі НКС комплексна не разглядаліся. Розныя аспекты дадзенай праблемы раскрываліся асобнымі даследчыкамі і прадстаўлены, галоўным чынам, у выглядзе навуковых артыкулаў. Можна вылучыць два этапы ў даследаванні нематэрыяльнай спадчыны беларускімі навукоўцамі: 1) 1991–2005 гг. і 2) 2006–2016 гг.

Асаблівасць першага этапа заключаецца ў тым, што праблемы дакументавання, вывучэння, інтэрпрэтацыі НКС беларускімі даследчыкамі калі і закраналася, то, як правіла, у кантэксце больш шырокіх тэм. У гэты перыяд з'яўляюцца публікацыі музейных практыкаў А. М. Белакоза, А. М. Калбаскі, Г. І. Лапаціна, Г. Р. Нячаевай, І. Ю. Смірновай, Н. В. Філатавай і інш. У артыкулах сярод іншага ўздымаліся праблемы захавання рамёстваў і промыслаў, уключэння традыцыйнай культуры ў адукацыйны працэс, інтэрпрэтацыі этнаграфічнай спадчыны музеямі, дзейнасці музеяў-запаведнікаў. Музейныя спецыялісты ў 1991–2005 гг. у сваіх даследаваннях нематэрыяльную спадчыну разглядалі як кантэкстную інфармацыю, вывучэнне якой было звязана з неабходнасцю вывучэння этнаграфічных калекцый, гісторыі іх фарміравання.

Другі этап у даследаванні НКС пачынаецца з уступленнем у сілу ў Рэспубліцы Беларусь Канвенцыі 2003 г. (20 красавіка 2006 г.). Гэта прывяло да неабходнасці імплементацыі палажэнняў канвенцыі ў нацыянальнае заканадаўства, рэалізацыі мер па захаванні НКС. Адпаведна актывізаваліся даследаванні ў галіне нематэрыяльнай спадчыны. Даследаванні беларускіх вучоных былі прадстаўлены, галоўным чынам, у выглядзе асобных артыкулаў. Гэта сярод іншага публікацыі М. Н. Сатолінай, Н. Д. Хвір, Т. Б. Варфаламеевай, Э. К. Дарашэвіча, А. А. Сушы, І. М. Сімаковай, Л. М. Гайдукевіча, А. Б. Сташкевіч, В. А. Кліцуновай, М. А. Міхайлеца, Т. В. Мармыш. У артыкулах разглядаліся пытанні нарматыўна-прававога рэгулявання сферы НКС, практычныя мерапрыемствы, скіраваныя на захаванне нематэрыяльнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь. Былі закрануты пытанні музеефікацыі НКС і яе інтэрпрэтацыі, дакументавання музеямі гэтай спадчыны, уключэння нематэрыяльнай спадчыны ў турыстычную сферу, этычныя прынцыпы пры рабоце з НКС і інш.

У 2016 г. з'явілася навуковае даследаванне абагульняючага характару, калі С. К. Канановіч абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме «Рэпрэзентацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўстановамі культуры Рэспублікі Беларусь»[3]. Даследчыца імкнулася з пункту гледжання культуралогіі асэнсаваць феномен нематэрыяльнай спадчыны, паказаць працу ўстаноў культуры па прадстаўленні НКС Рэспублікі Беларусь. У дысертацыі праблема разглядалася ў даволі шырокім кантэксце. Была зроблена спроба прааналізаваць дзейнасць усіх устаноў культуры Рэспублікі Беларусь па рэпрэзентацыі НКС. У дачыненні да работы музеяў з нематэрыяльнай спадчынай прыведзены

---

[3] Кананові, С. К. Рэпрэзентацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўстановамі культуры Рэспублікі Беларусь : дыс. ... канд. культуралогіі : 24.00.01 / С. К. Кананові. – Мінск, 2016. – 210 л.

прыклады, галоўным чынам, экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці і толькі некаторых музеяў, у той час як праблемы дакументавання і вывучэння НКС музеямі ўвогуле не закраналіся.

У *расійскай гістарыяграфіі* пытанні музейнай інтэрпрэтацыі НКС і ролі музея ў захаванні гэтай спадчыны, у параўнанні з айчыннай гістарыяграфіяй, распрацаваны больш падрабязна.

Ужо ў 2002 г. у адным са сваіх артыкулаў музеёлаг М. Е. Каўлен намагалася акрэсліць межы ўзаемадзеяння музея і носьбітаў НКС, вызначыць магчымыя перспектывы ўключэння нематэрыяльнай спадчыны ў музейную дзейнасць[4]. Праз год пад рэдакцыяй М. Е. Каўлен выйшаў падручнік «Музейная справа Расіі». Аўтары навучальнага дапаможніка сцвярджалі, што менавіта ў ім упершыню ў Расіі ў музеязнаўчы дапаможнік уводзіцца паняцце «нематэрыяльны аб'ект»[5].

На старонках часопіса «Музей» (2009 г.) публікуецца «Слоўнік актуальных музейных тэрмінаў», дзе было змешчана азначэнне паняцця «нематэрыяльная культурная спадчына»[6]. Гэта ж азначэнне пазней увайшло ў электронную версію Расійскай музейнай энцыклапедыі, але было пашырана. І на дадзены момант артыкул аб НКС асвятляе найбольш важныя пытанні методыкі працы музеяў з нематэрыяльнай спадчынай, спосабы яго вывучэння і прэзентацыі, выкарыстанне ў музейна-педагагічнай дзейнасці і інш. Уключэнне паняцця «нематэрыяльная культурная спадчына» ў спецыяльныя музейныя слоўнікі спрыяла яго ўкараненню ў тэарэтычным і прыкладным расійскім музеязнаўстве.

Абагульняючы характар насілі расійскія дысертацыйныя даследаванні, якія былі прысвечаны менавіта праблеме музейнага захавання НКС. У 2011 г. была абаронена дысертацыя Г. К. Бялугінай па тэме «Актуалізацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў музейна-выставачнай і турысцка-рэкрэацыйнай дзейнасці (на прыкладзе Іванаўскай вобласці)»[7]. Разглядаючы выставачную дзейнасць музеяў, культуролаг Г. К. Бялугіна, на нашу думку, больш увагі ўдзяліла з'явам культуры, якія да НКС у яе навуковым разуменні аднесці нельга. Пры аналізе музейных свят як магчымай формы культурна-

---

[4] Каулен, М. Е. Нематериальные объекты наследия в современном музее / М. Е. Каулен // От краеведения к культурологии: Российскому институту культурологии – 70 лет : сб. ст. / редкол.: К. Э. Разлогов (отв. ред.) [и др.]. – М., 2002. – С. 233–247.

[5] Музейное дело России / Е. А. Воронцова [и др.] ; Акад. переподгот. работн. искусства, культуры и туризма, Рос. ин-т культурологии МК РФ ; под общ. ред. М. Е. Каулен (отв. ред.), И. М. Коссовой, А. А. Сундиевой. – М. : ВК, 2003. – С. 12.

[6] Словарь актуальных музейных терминов // Музей. – 2009. – № 5. С. 47–68.

[7] Белугина, Г. К. Актуализация нематериального культурного наследия в музейно-выставочной и туристско-рекреационной деятельности: на примере Ивановской области : дис. … канд. культурологии : 24.00.01 / Г. К. Белугина. – Ярославль, 2011. – 199 л.

адукацыйнай работы з НКС у дысертацыйным даследаванні аўтар прыходзіць да высновы, што музейныя святы спрыяюць у большай ступені папулярызацыі, чым захаванню гэтай спадчыны. Дадзеная выснова падцвярджае атрыманыя намі вынікі пры разглядзе музейных свят, якія праводзіліся беларускімі музеямі ў 1991–2016 гг.

У 2012 г. была абаронена дысертацыя Л. А. Клімава «Музей у захаванні і прэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны»[8]. Аўтар у даследаванні шмат увагі ўдзяліў тэарэтыка-метадалагічным аспектам НКС. Даследаванне закранае і музеязнаўчы бок праблемы, а менавіта пытанні музейнага мадэлявання рэчаіснасці, у тым ліку і мадэляванне тых ці іншых элементаў НКС у межах культурна-адукацыйных музейных праектаў, магчымасцяў музейнай прэзентацыі НКС, выкарыстання музейнай педагогікі для захавання нематэрыяльнай спадчыны і інш.

Расійская гістарыяграфія вылучаецца наяўнасцю профільнага музейнага перыядычнага выдання, на старонках якога неаднаразова з’яўляліся публікацыі прысвечаныя НКС. Гэта навуковы часопіс Расійскага этнаграфічнага музея «Музей. Традиции. Этничность», заснаванага ў 2012 г. Выйшла восем нумароў, у якіх змешчаны даследаванні аб выставачных праектах, дзе прэзентаваліся элементы НКС, аб палявых даследаваннях, культурна-адукацыйных праектах у галіне НКС і інш[9].

Цікавасць расійскіх даследчыкаў да НКС застаецца высокай, нават не гледзячы на тое, што Расійская Федэрацыя не ратыфікавала Канвенцыю 2003 г. У апошнія гады з’яўляюцца публікацыі, прысвечаныя праблемам інтэрпрэтацыі нематэрыяльнай спадчыны краязнаўчымі музеямі, выкарыстання НКС у турыстычнай сферы, захавання НКС у суб’ектах Расійскай Федэрацыі і інш.

У *замежнай гістарыяграфіі* праблема захавання, музеефікацыі, інтэрпрэтацыі НКС распрацаваны дэтальна і глыбока. Менавіта з замежнай гістарыяграфіі прыходзіць само паняцце «нематэрыяльная культурная спадчына». Значную ролю ва ўвядзенні гэтага паняцця ў навуковы зварот адыгралі профільныя музейныя выданні («ICOFOM Study Series» («Даследаванні ІКАФОМ»), «ICOM News» («Навіны ІКОМа»), «Museum International» («Міжнародны музей»)), а з 2006 г. асобнае выданне, цалкам

[8] Климов, Л. А. Музей в сохранении и презентации нематериального культурного наследия : дис. ... канд. культурологии : 24.00.03 / Л. А. Климов. – СПб., 2012. – 231 л.

[9] Калашникова, Н. М. Выставочные проекты «Антропология вещи» в Российском этнографическом музее (изучение и экспонирование) / Н. М. Калашникова // Музей. Традиции. Этничность. – 2012. – № 1. – С. 94–103; Ермолин, Д. С. Этнокультурные стереотипы потомков балканских колонистов Буджака и Приазовья (по материалам экспедиций 2012 г.) / Д. С. Ермолин // Музей. Традиции. Этничность. – 2012. – № 2. – С. 124–134; Ботякова, О. А. Современная культурно-образовательная практика Российского этнографического музея в начале XXI века / О. А. Ботякова // Музей. Традиции. Этничность. – 2014. – № 2. – С. 60–73.

прысвечанае НКС, «International Journal of Intangible Heritage» («Міжнародны часопіс нематэрыяльнай спадчыны»). Даследчыкі з розных краін на старонках выданняў прадставілі вопыт працы музеяў з нематэрыяльнай спадчынай, паказалі магчымасць музейнага захавання, інтэрпрэтацыі гэтай спадчыны.

З цягам часу ў замежнай гістарыяграфіі з’яўляюцца як асобныя артыкулы ці іх зборнікі па тэме, так і манаграфічныя даследаванні. У 2008 г. выйшла кніга даследчыкаў культурнай спадчыны Л. Сміт і Н. Акагава пад назвай «Intangible Heritage» («Нематэрыяльная спадчына»). Даследчыкі шмат увагі адвялі праблеме ўдзелу ў захаванні НКС музеяў. Яны прывялі прыклады рэалізацыі метада «мясцовых куратараў» (асаблівага спосабу паказа ў музейнай прасторы ведаў, тэхналогій, уменняў) у розных частках свету. Аўтары прапанавалі і абгрунтавалі тэзіс, што музеі ў працэс захавання нематэрыяльнай спадчыны ўключыліся задоўга да прыняцця Канвенцыі 2003 г. і ў пэўных выпадках адыгрывалі ключавую ролю ў гэтых працэсах.

Непасрэдна праблеме музейнага захавання НКС было прысвечана даследаванне 2012 г. М. Алівізатоў «Intangible Heritage and the Museum: New Perspectives on Cultural Preservation» («Нематэрыяльная спадчына і музей: новыя магчымасці захавання культуры»).

У апошні час з’яўляецца ўсё больш публікацый па праблемных пытаннях у сферы музейнай інтэрпрэтацыі нематэрыяльнай спадчыны: адукацыйныя магчымасці музея і НКС, праблемы дакументавання музеямі НКС, альтэрнатыўным спосабам музейнага захавання НКС і інш[10].

У раздзеле **1.2 «Крыніцы»** даецца пералік і кароткі аналіз асноўных крыніц, выкарыстаных у даследаванні.

Пры напісанні дысертацыйнага даследавання самым шматлікім і інфарматыўным тыпам крыніц былі **пісьмовыя** (*дакументальныя* (дакументы заканадаўства, матэрыялы справаводства, статыстычныя матэрыялы) і *апавядальныя*).

*Дакументы заканадаўства* ўключаюць нарматыўна-прававыя акты, якія ў разглядаемы перыяд рэгламентавалі розныя сферы дзейнасці, так ці інакш звязаныя з НКС. Найбольш грунтоўна разглядаліся пытанні захавання і інтэрпрэтацыі НКС у Законе Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», а таксама ў Законе

---

[10] Tekin, G. Transforming museology and learning in museums: Ankara intangible cultural heritage museum / G. Tekin // Milli Egitim. – 2017. – Vol. 214. – P. 155–166; Carvalho, A. Intangible heritage and museums: new and old challenges? [Electronic resource] / A. Carvalho // ICOM. – Mode of access: http://network.icom.museum/cidoc/blog/-anacarvalho/. – Date of access: 19.09.2019; Ferrer-Yulfo, A. An alternative approach to safeguarding intangible cultural heritage: the case of the Museo del Baile Flamenco, Sevil / A. Ferrer-Yulfo // Intern. J. of the Inclusive Museum. – 2018. – Vol. 10. – P. 47–57.

ад 12 снежня 2005 г. «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь». Вынікам кадэфікацыі заканадаўства ў сферы культуры стала прынящце ў 2016 г. Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, які ўступіў у сілу 3 лютага 2017 г.

Вынікам міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы захавання НКС стала прынящце ў кастрычніку 2003 г. канвенцыі «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны». У тэксце дакумента прапісаны асноўныя мерапрыемствы па захаванні НКС на міжнародным і нацыянальным узроўнях, абавязкі краін-удзельніц канвенцыі.

*Матэрыялы справаводства* былі прадстаўлены дакументамі справаводства музеяў і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Сярод дакументаў справаводства музеяў магчыма вылучыць:

– арганізацыйную дакументацыю (палажэнне аб музеі, аб навукова-даследчай і экспазіцыйнай рабоце);

– распарадчую дакументацыю (рашэнні, прыказы, музейныя інструкцыі, метадычныя ўказанні);

– планавую дакументацыю (тэматыка-экспазіцыйныя планы, навуковыя канцэпцыі музеяў);

– справаздачы.

Неабходна адзначыць, што дадзеныя крыніцы, як правіла, захоўваюцца ў музейных архівах. У частцы музеяў дадзеныя матэрыялы выдатна сістэматызаваны і пастаўлены на ўлік (як у архіве НПГКМЗ, ВМСБТ імя Ф. Р. Шклярава), але найчасцей захоўваюцца бессістэмна.

У якасці крыніцы па тэме даследавання таксама выступаюць матэрыялы справаводства Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь[11].

*Статыстычныя матэрыялы* былі прадстаўлены зборнікамі «Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва», зборнікамі Беларускага інстытута праблем культуры, матэрыяламі анкетнага апытання.

Найбольш інфарматыўнай крыніцай па тэме з’яўляюцца матэрыялы анкетнага апытання «Дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь па ахове і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991–2016 гг.», якія знаходзяцца ў архіве ІМЭФ НАН Беларусі (Ф. 9. Воп. 5. Спр. 36–41.). Апытанне праводзілася кафедрай этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ у 2017–2018 гг. для чаго аўтарам даследавання была распрацавана спецыяльная апытальная форма. Анкеты ў электронным выглядзе былі разасланы ва ўсе 102 даследуемыя музеі ў лютым 2017 г. У перыяд з лютага 2017 г. па красавік

[11] Пр. Матэрыялы дасье на ўключэнне вясельнай каравайнай традыцыі вёскі Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей // Архіў бягучага справаводства Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

2018 г. былі атрыманы адказы ў выглядзе запоўненых анкет ад 74 музеяў, што склала 73% ад усіх даследуемых. У кожнай з абласцей адказы атрыманы больш чым ад 50% даследуемых музеяў. У выніку апрацоўкі атрыманыя матэрыялы былі сістэматызаваны па геаграфічным прынцыпе і здадзены на захоўванне ў архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Дадзеныя матэрыялы змяшчаюць унікальныя звесткі аб рабоце музеяў Рэспублікі Беларусь з нематэрыяльнай спадчынай у перыяд з 1991–2016 гг.

Да *апавядальных* крыніц магчыма аднесці музейныя выданні (пуцяводнікі па экспазіцыі, каталогі, брашуры і інш.). Музейныя каталогі і пуцяводнікі з'яўляюцца крыніцай, якая дазваляе меркаваць аб вывучанасці калекцый этнаграфіі, асобных экспазіцыйных рашэннях у музеях, выкарыстоўваемых у культурна-адукацыйнай дзейнасці музея элементах НКС.

*Перыядычны друк* таксама з'яўляецца важнай інфарматыўнай крыніцай па тэме дысертацыйнага даследавання. Матэрыялы аб НКС, музеях і іх рабоце з нематэрыяльнай спадчынай, з'яўляюцца на старонках рэспубліканскіх, абласных і раённых газет.

*Рэчавымі крыніцамі* выступаюць, як правіла, асобныя музейныя прадметы, этнаграфічныя калекцыі. Яны даюць уяўленне аб структуры назапашаных у музеях этнаграфічных матэрыялаў, сведчаць аб наяўнасці буйных калекцый у іх складзе. Экспануемыя прадметы ў спалучэнні з вядучымі тэкстамі і этыкетажом, як правіла, адлюстроўваюць узровень навуковай апрацоўкі этнаграфічных матэрыялаў у музеі.

У даследаванні былі выкарыстаны *фотаматэрыялы*. Яны прадстаўлены фотафіксацыяй НКС (носьбітаў, тэхналагічных этапаў, абрадавых дзеянняў і г. д.), працэса дакументавання нематэрыяльнай спадчыны падчас музейных экспедыцый, экспазіцыйных рашэнняў музеяў.

У асобную групу крыніц магчыма вылучыць *інтэрнэт-рэсурсы*. За апошнія гады з невялікай старонкі-візіткі, простага прадстаўніцтва музея ў сетцы Інтэрнэт, музейныя сайты ператварыліся ў інфарматыўныя крыніцы аб культурна-адукацыйнай, экспазіцыйна-выставачнай і навукова-фондавай дзейнасці гэтых устаноў.

У раздзеле **1.3 «Метады даследавання»** разглядаюцца метады і метадалогія даследавання. Метадалогія навуковага даследавання будавалася на прынцыпах гістарычнага пазнання: *аб'ектыўнасці, гістарызму і сістэмнасці, каштоўнасці ў гісторыі.* Пры аналізе аб'екта і прадмета даследавання аўтарам былі выкарыстаны *агульналагічныя* (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя) і *агульнанавуковыя метады* (лагічны, узыходжанне ад канкрэтнага да

абстрактнага, узыходжанне ад абстрактнага да канкрэтнага, сістэмны падыход з выкарыстаннем прыёмаў структурнага і функцыянальнага аналізаў).

У працы знайшлі прымяненне міждысцыплінарны падыход і традыцыйныя спецыяльна-гістарычныя метады даследавання: *гісторыка-генетычны, кампаратыўны, гісторыка-сістэмны*.

У дысертацыйным даследаванні выкарыстаны *семіятычны метад*, які дазволіў прааналізаваць магчымасці прадстаўлення нематэрыяльнай спадчыны ў экспазіцыйна-выставачнай прасторы музея праз матэрыяльныя артэфакты. Для адсочвання дынамікі музейных экспедыцый, выставачных і культурна-адукацыйных праектаў выкарыстоўваўся *колькасны аналіз*. Для атрымання больш поўных звестак аб навукова-фондавай, экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай рабоце музеяў з НКС быў выкарыстаны адзін з метадаў сацыялогіі, а менавіта *анкетаванне*.

У другой главе **«Дакументаванне і вывучэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны музеямі»** паказана экспедыцыйная і навукова-фондавая дзейнасць музеяў, якая была накіравана на захаванне НКС.

У раздзеле **2.1 «Праблемы дакументавання. Экспедыцыйная дзейнасць музеяў»** разгледжаны тэарэтычны аспект музейнага дакументавання нематэрыяльнай спадчыны, паказаны праблемы, з якімі музейныя спецыялісты сутыкаліся пры рабоце з НКС. Прааналізаваны найбольш паспяховыя і эфектыўныя з пункту гледжання захавання НКС прыклады музейнага дакументавання НКС (Мотальскі музей народнай творчасці, Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў, Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава (далей ВМСБТ імя Ф.Р. Шклярава), Мазырскі аб’яднаны краязнаўчы музей, Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей, Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» (далей ГКМЗ «Заслаўе») і інш.).

У раздзеле **2.2 «Музейнае вывучэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны»** паказана, як навукова-фондавая дзейнасць музеяў спрыяла захаванню НКС. На падставе аналізу навукова-фондавай і выдавецкай дзейнасці музеяў выдзелена два этапы ў музейным вывучэнні НКС. Першы – 1991–2006 гг. Ён характарызуецца цікавасцю з боку музейных спецыялістаў да вывучэння, галоўным чынам, этнаграфічных калекцый, звязаных з нематэрыяльнай спадчынай. Другі этап 2006–2016 гг. вылучаецца як больш шырокім колам даследуемых праблем, так і якасна новым узроўнем публікацый. На другім этапе прасочваецца тэндэнцыя да эвалюцыі тэм даследаванняў ад вывучэння калекцый, іх сістэматызацыі да праблем

выкарыстання НКС у культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, прадстаўлення элементаў нематэрыяльнай спадчыны ў экспазіцыйна-выставачнай прасторы.

Трэцяя **глава «Адлюстраванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў экспазіцыйна-выставачнай прасторы»** прысвечана праблеме прадстаўлення ў музейнай экспазіцыі і на выстаўцы нематэрыяльнай спадчыны. У главе паказана, як уключэнне НКС у экспазіцыю музея, прадстаўленне яе на выстаўках дазваляла стварыць унікальную, пазнавальную, атрактыўную экспазіцыйна-выставачную прастору.

У раздзеле **3.1 «Прадстаўленне нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў стацыянарных экспазіцыях»** паказаны цяжкасці, з якімі сутыкнуліся музейныя спецыялісты пры адлюстраванні нематэрыяльнай спадчыны ў экспазіцыйнай прасторы, а таксама прыведзены прыклады найбольш удалых рашэнняў, што дазволілі музейнымі сродкамі адлюстраваць усе вобласці НКС.

Раздзел **3.2 «Паказ нематэрыяльнай культурнай спадчыны на музейных выстаўках»** раскрывае асаблівасці адлюстравання НКС на музейных выстаўках. У раздзеле паказаны магчымасці выкарыстання музейных выставак у якасці інструмента па папулярызацыі НКС, павышэння асвядомленасці аб ёй на рэгіянальным, рэспубліканскім і міжнародным узроўнях.

У чацвёртай главе **«Нематэрыяльная культурная спадчына ў культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў»** паказана, што культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь сярод астатніх накірункаў музейнай дзейнасці найлепшым чынам спрыяла захаванню НКС.

У раздзеле **4.1 «Культурна-адукацыйная работа як сродак захавання НКС»** адзначаецца, што найбольш эфектыўныя з пункту гледжання захавання нематэрыяльнай спадчыны такія формы культурна-адукацыйнай работы, як музейна-педагагічныя заняткі (цыклы заняткаў, адукацыйныя праграмы), музейныя аб’яднанні (клубы, гурткі), майстар-класы. Яны спрыялі павышэнню жыццяздольнасці элементаў НКС, непарыўнасці практыкі перадачы гэтай спадчыны, дазвалялі ў межах музея трансліраваць уменні, навыкі, тэхналагічныя прыёмы, уяўленні і г.д., звязаныя з нематэрыяльнай спадчынай.

Раздзел **4.2 «Папулярызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны праз культурна-адукацыйную работу»** паказвае, што ў культурна-адукацыйнай дзейнасці, скіраванай на папулярызацыю НКС, музеі Рэспублікі Беларусь выкарыстоўвалі разнастайныя формы работы: тэматычныя экскурсіі, лекцыі, тэатралізацыі, віктарыны, сустрэчы з носьбітамі традыцыі, рэканструкцыі абрадаў або іх частак, музейныя святы, гульні (на падставе

народных), квэсты, дэгустацыі і інш. У дадзеным выпадку культурна-адукацыйная дзейнасць з’яўлялася сродкам павышэння асвядомленасці аб нематэрыяльнай спадчыне, павелічэння цікавасці да яе.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Праблема дакументавання НКС музейнымі ўстановамі ў даследуемы перыяд прыцягвала ўвагу міжнароднай і беларускай музейнай супольнасці. Міжнародны вопыт сведчыць аб імкненні музейных устаноў пры дакументаванні НКС карыстацца новай парадыгмай «удзелу». Яна прадугледжвае перанясенне акцэнту з фіксацыі НКС на работу з яе носьбітамі, заахвочвае да самадакументавання нематэрыяльнай спадчыны членамі лакальных супольнасцяў. Музеі Рэспублікі Беларусь у даследуемы перыяд займаліся дакументаваннем НКС, але разглядалі яе ў якасці кантэкстнай інфармацыі. Адпаведна яны ў першую чаргу арыентаваліся на захаванне прадметаў, звязаных з нематэрыяльнай спадчынай, а не самой НКС. У той жа час папаўненне фондаў музея такімі прадметамі спрыяла далейшаму вывучэнню НКС, выкарыстанню іх у экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай рабоце.

Найбольш часта музейныя спецыялісты дакументавалі такія вобласці НКС, як традыцыйныя рамёствы, традыцыйныя цырымоніі, выканальніцкія мастацтвы. Дакументаванне элементаў НКС, якія не заўсёды звязаны з канкрэтнымі прадметамі, не маюць рэчавага ўвасаблення (вусныя традыцыі і формы выражэння, светапогляд, міфалогія), выклікала значныя цяжкасці. Дадзеныя вобласці НКС або ігнараваліся, або ўспрымаліся як кантэкстная інфармацыя і фіксаваліся фрагментарна. Такое становішча было абумоўлена яшчэ і тым, што дакументаванне НКС, акрамя матэрыяльна-тэхнічнага забяспячэння, патрабавала спецыяльнай падрыхтоўкі музейных супрацоўнікаў і метадычных распрацовак (апытальнікі, анкетныя формы і інш), якімі былі забяспечаны далёка не ўсе музеі. Найбольш актыўна дакументаваннем НКС музеі займаліся падчас музейных экспедыцый. У працэсе дакументавання НКС музеі супрацоўнічалі з іншымі ўстановамі адукацыі і культуры, што дазваляла пашырыць тэрытарыяльныя межы экспедыцый, прыцягнуць да працы спецыялістаў адпаведнай кваліфікацыі [2; 4; 13].

2. У вывучэнні НКС музеямі Рэспублікі Беларусь вылучаецца два этапы: 1) 1991–2005 гг. і 2) 2006–2016 гг. Першы этап характарызаваўся ўвагай даследчыкаў да вывучэння і сістэматызацыі музейных калекцый, звязаных з

НКС, і самой НКС у межах этнаграфічных даследаванняў музеяў. У выніку чаго большасць музейных публікацый была прысвечана традыцыйным рамёствам і цырымоніям. Другі этап характарызаваўся новым тэарэтыка-метадалагічным узроўнем даследаванняў, большай увагай да ролі музеяў у захаванні і інтэрпрэтацыі НКС, да праблем актуалізацыі, падтрымання жыццяздольнасці НКС.

Публікацыі музеяў, прысвечаныя НКС, ахоплівалі ўвесь спектр выданняў: ад манаграфічных даследаванняў да музейных каталогаў і інфармацыйных буклетаў. Музеі ў разглядаемы перыяд выступалі ў якасці арганізатараў навукова-практычных канферэнцый. Музейныя навукова-практычныя канферэнцыі прыцягвалі ўвагу да НКС не толькі музейных супрацоўнікаў, але таксама акадэмічных спецыялістаў, што спрыяла ўсебаковаму, комплекснаму вывучэнню дадзенага феномену культуры. У выніку музейныя даследаванні сталі адной з важных мер па захаванні нематэрыяльнай спадчыны [2; 5; 11].

3. Найчасцей у стацыянарных экспазіцыях музеяў спецыялісты адлюстроўвалі традыцыйныя рамёствы і промыслы рэгіёна. Гэта было абумоўлена магчымасцю праз дэманстрацыю сыравіны, інструментаў, фотаздымкаў працэсу і гатовых вырабаў паказаць тое ці іншае рамяство. Найбольш эфектыўным з пункту гледжання захавання НКС варыянтам прадстаўлення рамёстваў была арганізацыя дзеючых рамесных майстэрняў. Яны маглі ўключацца ў асноўную экспазіцыю (Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў), дзейнічаць у асобным памяшканні (Івянецкі музей традыцыйнай культуры), працаваць у выглядзе філіяла (Столінскі раённы краязнаўчы музей). Менавіта такое адлюстраванне рамёстваў і промыслаў дазваляла наведвальнікам пазнаёміцца з аўтэнтычнай тэхналогіяй і носьбітамі НКС. Гэты варыянт прадстаўлення дадзенай вобласці НКС у экспазіцыі спрыяў не толькі яе папулярызацыі, але і захаванню.

Значная частка музеяў у сваіх экспазіцыях абмежавалася прадстаўленнем побыту і сельскагаспадарчых заняткаў. Такія экспазіцыі характарызаваліся аднатыпнасцю рашэнняў, спрошчаным прадстаўленнем НКС. У той жа час прыклады экспазіцый ГКМЗ «Заслаўе», Браслаўскага раённага аб’яднання музеяў, Івянецкага музея традыцыйных культур, Музея «Бездзежскі фартушок» і шэрагу іншых музеяў паказалі, што музейнымі сродкамі магчыма адлюстраваць усе вобласці НКС. У параўнанне з іншымі метадамі пабудовы экспазіцыі, сюжэтна-вобразны метад (ВМСБТ імя Ф.Р. Шклярава, Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер’я НПГКМЗ, Музея народнай культуры Мазыршчыны «Палеская веда») паказаў найбольшыя магчымасці для адлюстравання розных абласцей НКС. Уключэнне НКС у экспазіцыі музеяў

дазваляла стварыць унікальную, пазнавальную, атрактыўную экспазіцыйную прастору [6; 16].

4. У параўнанні з прадстаўленнем НКС у стацыянарных экспазіцыях, паказ нематэрыяльнай спадчыны на выстаўках адрозніваўся большай разнастайнасцю адлюстраваных тэм, варыятыўнасцю ў спосабах прадстаўлення нематэрыяльнай спадчыны. Музеі Рэспублікі Беларусь змаглі на выстаўках раскрыць тэмы светапогляду (Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна), народнага гумару (Калінкавіцкі краязнаўчы музей), традыцыйнай культуры харчавання (Дзятлаўскі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей), народных казак (Любанскі музей народнай славы), музычных традыцый (Пастаўскі краязнаўчы музей), традыцыйных гульняў (Уздзенскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей) і інш. Частка музеяў рыхтавала справаздачныя выстаўкі па выніках экспедыцыйнай дзейнасці (ВМСБТ імя Ф.Р. Шклярава, Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей), дзе НКС прадстаўлялася комплексна.

Праз падрыхтоўку і паказ выставак музеі актыўна ўдзельнічалі ў святах, фестывалях, конкурсах, іншых мерапрыемствах па-за музеем. Выязныя выстаўкі дазвалялі прадставіць унікальныя элементы НКС і традыцыйную культуру як у розных рэгіёнах Рэспублікі Беларусь, так і за яе межамі. Гэта садзейнічала папулярызацыі НКС, паказвала ўключанасць музеяў у працэс захавання нематэрыяльнай спадчыны. На рэгіянальным узроўні выстаўкі былі, як правіла, скіраваны на папулярызацыю НКС сярод лакальных супольнасцяў, усведамленне імі важнасці гэтай спадчыны. На рэспубліканскім і міжнародным узроўні выстаўкі, прысвечаныя НКС, прадстаўлялі багацце нацыянальных традыцый, выконвалі рэпрэзентатыўную функцыю [3; 6].

5. Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь сярод іншых накірункаў музейнай дзейнасці найлепшым чынам спрыяла захаванню НКС. Сярод форм культурна-адукацыйнай работы ў якасці сродку захавання нематэрыяльнай спадчыны найбольш эфектыўнымі былі музейна-педагагічныя заняткі (цыклы заняткаў, адукацыйныя праграмы), майстар-класы і музейныя аб'яднанні (клубы, гурткі).

Часцей за ўсё ў культурна-адукацыйнай рабоце музеі выкарыстоўвалі форму музейна-педагагічных заняткаў. З аднаго боку найбольшую колькасць заняткаў іх аўтары прысвяцілі рамёствам і промыслам, традыцыйным цырымоніям, традыцыйнай ежы, але з другога боку ўдзялілі ўвагу вусным традыцыям і формам выражэння, выканальніцкім мастацтвам, міфалогіі і светапогляду. Заняткі, як правіла, прадугледжвалі тэарэтычную частку, дзе ўдзельнікі знаёміліся з пэўнай вобласцю НКС ці элементам, і практычную, падчас якой адбывалася засваенне канкрэтных уменняў, навыкаў, нормаў

паводзін, звязаных з нематэрыяльнай спадчынай. Большасць музейна-педагагічных заняткаў і праграм была скіравана на патэнцыйных носьбітаў нематэрыяльнай спадчыны – дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

Майстар-класы часцей за ўсё выкарыстоўваліся разам з іншымі формамі культурна-адукацыйнай работы, але маглі праводзіцца і самастойна. Выкарыстанне майстар-класаў дазваляла ўдзельнікам атрымаць практычны вопыт, уключыцца ў творчы працэс, авалодаць канкрэтнымі ўменнямі і навыкамі, звязанымі з НКС.

Важнай для захавання НКС з’яўлялася дзейнасць музейных аб’яднанняў (Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў, філіял ВМСБТ імя Ф.Р. Шклярава ў Гомелі, Дрыбінскі гісторыка-этнаграфічны музей, Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей і інш.). Музейныя клубы і гурткі з’яўляліся пляцоўкамі, дзе адбывалася камунікацыя паміж носьбітамі НКС, музейнымі спецыялістамі, наведвальнікамі. У выніку дзейнасці музейных аб’яднанняў адбывалася трансляцыя нематэрыяльнай спадчыны, а праз гэта – яе захаванне. Музейныя аб’яднанні дазвалялі на практыцы рэалізоўваць парадыгму ўдзелу праз уключэнне ў захаванне НКС носьбітаў, лакальных супольнасцяў, музейных спецыялістаў і ўсіх зацікаўленых асоб [1; 8; 14].

6. У культурна-адукацыйнай дзейнасці, скіраванай на папулярызацыю НКС, музеі Рэспублікі Беларусь выкарыстоўвалі разнастайныя формы работы: тэматычныя экскурсіі, лекцыі, тэатралізаваныя экскурсіі, віктарыны, сустрэчы з носьбітамі традыцыі, рэканструкцыі абрадаў або іх частак, музейныя святы, гульні (на падставе народных), квэсты, дэгустацыі і інш. У дадзеным выпадку культурна-адукацыйная дзейнасць з’яўлялася сродкам павышэння асвядомленасці аб нематэрыяльнай спадчыне, павелічэння цікавасці да яе, росту павагі да НКС сярод носьбітаў, лакальных супольнасцяў.

Найбольш супярэчным момантам у культурна-адукацыйнай рабоце музеяў з НКС з’яўляецца музейная рэканструкцыя традыцыйных цырымоній (святаў, абрадаў, звычаяў). У большасці выпадкаў такая музейная рэканструкцыя прыводзіла да спрашчэння традыцыі або яе скажэння, бо музейная прастора не была прыстасавана да правядзення падобных цырымоній, а гледачы і магчымыя ўдзельнікі не з’яўляліся носьбітамі НКС. У той жа час музеі ўключаліся ў правядзенне аўтэнтычных абрадаў (Лунінецкі раённы краязнаўчы музей), праз што паказалі шлях удзелу ў традыцыйных цырымоніях без іх скажэння.

Музейныя святы і фестывалі былі, як правіла, самымі масавымі мерапрыемствамі, скіраванымі на папулярызацыю НКС. Музеі станавіліся

месцам правядзення такіх фестываляў (БДМНАП), выступалі ў якасці ўдзельнікаў (Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна), рэалізоўвалі трансгранічныя праекты (Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей).

Камунікацыя музея з аўдыторыяй і мясцовай супольнасцю найбольш эфектыўна ажыццяўлялася там, дзеназіралася супрацоўніцтва з іншымі ўстановамі культуры (Дамамі і Цэнтрамі рамёстваў, Дамамі культуры, бібліятэкамі), установамі адукацыі (дзіцячымі садкамі, школамі, ВНУ), а таксама фальклорнымі калектывамі і недзяржаўнымі арганізацыямі [3; 9; 12].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Факталагічны матэрыял дысертацыйнага даследавання выкарыстаны ў навуковай і культурна-адукацыйнай дзейнасці ўстановы культуры «Карэліцкі раённы краязнаўчы музей» (акт укаранення ад 12.09.2019).

На падставе матэрыялаў даследавання распрацаваны турыстычныя маршруты кампаніі ТАА «БелАграТрэвал», якія ўключаюць знаёмства з музеямі, што найбольш актыўна працуюць з НКС (акт укаранення ад 10.09.2019). Вынікі дысертацыйнага даследавання выкарыстаны пры падрыхтоўцы матэрыялаў для ўдзелу ў міжнародных праектах па развіцці турызму ў Рэспубліцы Беларусь у грамадскім аб’яднанні «Рэспубліканскі саюз турыстычнай індустрыі» (акт укаранення ад 11.09.2019).

Высновы, сфармуляваныя ў даследаванні, могуць быць выкарыстаны для фарміравання дзяржаўнай культурнай палітыкі ў галіне НКС, удасканалення нарматыўна-прававога рэгулявання пытанняў захавання нематэрыяльнай спадчыны, распрацоўкі адпаведных метадычных рэкамендацый, інструкцый. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны айчыннымі музеямі пры рэалізацыі навукова-даследчых, экспазіцыйна-выставачных і культурна-адукацыйных праектаў.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых выданнях у адпаведнасці з п.18 Палажэння аб прысуджэнні навуковых ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь

1. Філіпчык, Д. Абрад «Варваркі»: змест, асаблівасці, перспектывы захавання / Д. Філіпчык // Беларус. гіст. часоп. – 2016. – № 4. – С. 19–24.

2. Філіпчык, Д. У. Вывучэнне і актуалізацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-

запаведнікам у 1991–2016 гг. / Д. У. Філіпчык // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитар. науки. – 2018. – № 1. – С. 110–118.

3. Філіпчык, Д. У. Інтэрпрэтацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны музеямі Брэсцкай вобласці ў 1991–2016 гг. / Д. У. Філіпчык // Науч. тр. Респ. ин-та высш. шк. Сер.: Ист., психол.-пед. науки / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2018. – Вып. 18, ч. 1. – С. 396–403.

4. Філіпчык, Д. У. Дакументаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны музеямі Рэспублікі Беларусь у 1991–2016 гг. / Д. У. Філіпчык // Гуманітарна-эканамічны веснік : навукова-тэарэтычны часопіс / заснавальнік Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут. – 2018. – № 3/4. – С. 132–137.

5. Філіпчык, Д. У. Вывучэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны музеямі Рэспублікі Беларусь як сродак яе захавання (1991–2016 гг.) / Д. У. Філіпчык // Научные труды Республиканского института высшей школы. – 2019. – Вып. 19, ч. 2. – С. 123–130

6. Філіпчык, Д. «Жывая» экспазіцыя: нематэрыяльная спадчына ў экспазіцыйнай прасторы беларускіх музеяў / Д. Філіпчык // Беларус. гіст. часоп. – 2019. – № 6. – С. 33–39.

**Артыкулы ў іншых навуковых выданнях**

7. Філіпчык, Д. У. Адметныя асаблівасці абыдзённага абраду ў вёсцы Папшычы Глыбоцкага раёна / Д. У. Філіпчык // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2013. – Вып. 15. – С. 389–396.

**Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый**

8. Філіпчык, Д. Ахова элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны праз іх уключэнне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (на прыкладзе абраду жыхароў в. Папшычы «Насіць намётку») / Д. Філіпчык // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. пр. удзельнікаў VIII Міжнар. навук. канф., Мінск, 25–27 крас. 2014 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў [і інш.] ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 38–40.

9. Філіпчык, Д. У. Выкарыстанне нематэрыяльнай культурнай спадчыны для развіцця турызму ў рэгіёнах (на прыкладзе Глыбоцкага раёна) / Д. У. Філіпчык // Этнос и культура: развитие и взаимодействие : сб. материалов Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 9–10 июня 2016 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Т. А. Новогродский [и др.]. – Минск, 2016. – С. 239–242.

10. Філіпчык, Д. У. Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей у справе захавання беларускай традыцыйнай культуры (1997–2016 гг.) / Д. У. Філіпчык // Проблемы истории и культуры пограничья: гуманитарное знание и вызовы времени : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 200-летию И. Е. Храповицкого, Верхнедвинск, 16 июня 2017 г. – Верхнядзвінск, 2017. – С. 176–178.

11. Філіпчык, Д. У. Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей як цэнтр інтэрпрэтацыі традыцыйнай культуры (1995–2016 гг.) / Д. У. Філіпчык // Музей і культурная спадчына: гісторыя, сучаснасць, погляд у будучыню : да 25-годдзя адкрыцця спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» (па напрамках) на гістарычным факультэце БДУ : зб. матэрыялаў міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27–28 чэрв. 2017 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. А. Гужалоўскі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 283–288.

12. Філіпчык, Д. У. Выкарыстанне нематэрыяльнай культурнай спадчыны муземі як сродак павышэння турыстычнай атрактыўнасці рэгіёну (на прыкладзе Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея) / Д. У. Філіпчык // Современная туристическая индустрия: актуальные проблемы и перспективы развития : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 24–25 мая 2018 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Т. А. Новогродский, И. В.Олюнина (отв. ред.). – Минск, 2018. – С. 155–158.

13. Філіпчык, Д. У. Праблемы музейнага дакументавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны / Д. У. Філіпчык // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : [XII] зб. навук. пр. (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў [і інш.] ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 45–47.

14. Філіпчык, Д. У. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў музеі як сродак захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны / Д. У. Філіпчык // Роль университетского образования и науки в современном обществе : материалы междунар. науч. конф., Минск, 26–27 февр. 2019 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: А. Д. Король (пред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2019. – С. 309–312.

15. Філіпчык, Д. У. Выкарыстанне музеямі Рэспублікі Беларусь нематэрыяльнай культурнай спадчыны для фарміравання нацыянальнакультурнай ідэнтычнасці / Д. У. Філіпчык // Тэарэтычныя і прыкладныя аспекты этналагічных даследаванняў : зборнік навуковых артыкулаў / пад навук. рэд. : Н. П. Мартысюк – Мінск : БНТУ, 2019. – С. 30–35.

16. Філіпчык, Д. У. Змена музейнай парадыгмы ў захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны / Д. У. Філіпчык // Национальные культуры в межкультурной коммуникации (Новая парадигма охраны культурного и природного наследия) : сб. науч. ст. по материалам

IV Междунар. науч.-пр. конф., Минск (11–12 апр. 2019 г.). / ред.-кол.: Т. С. Супранкова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Колоград, 2019. – С. 91–99.

**Тэзісы выступленняў на навуковых канферэнцыях**

17. Філіпчык, Д. У. Інтэрпрэтацыя калядных традыцый музеямі Рэспублікі Беларусь / Д. У. Філіпчык // Божае Нараджэнне як феномен агульначалавечай культуры : II Навук.-практ. канф., Віцебск, 17 снеж. 2016 г. : тэз. дакл. / Віцеб. дзярж. ун-т, Віцеб. дыяцэзія Рым.-Каталіц. касцёла ў Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2016. – С. 53–58.

# РЭЗЮМЭ

## Філіпчык Дзяніс Уладзіміравіч

## Нематэрыяльная культурная спадчына ў дзяржаўных музеях Рэспублікі Беларусь (1991–2016 гг.)

**Ключавыя словы:** нематэрыяльная культурная спадчына, музейнае дакументаванне, навукова-даследчая работа, экспазіцыйна-выставачная прастора, культурна-адукацыйная дзейнасць.

**Мэта даследавання:** выявіць сутнасць і змест дзейнасці дзяржаўных музеяў Рэспублікі Беларусь па дакументаванні, вывучэнні, інтэрпрэтацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991–2016 гг.

**Метады даследавання:** агульнанавуковыя: аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, параўнанне, абагульненне; спецыяльна-гістарычныя: гісторыка-генетычны, гісторыка-сістэмны, кампаратыўны; колькасны аналіз, семіятычны метад, анкетаванне.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** у дысертацыі ўпершыню вызначаны асаблівасці музейнага дакументавання НКС, вылучаны этапы ў музейным вывучэнні НКС, паказана значнасць навукова-даследчай дзейнасці музеяў для захавання НКС. Вызначаны тэндэнцыі прадстаўлення НКС у экспазіцыйна-выставачнай прасторы. Выдзелены метад пабудовы экспазіцыі, які дазваляе адлюстроўваць усе вобласці нематэрыяльнай спадчыны. У дысертацыйным даследаванні вылучаны найбольш эфектыўныя з пункту гледжання захавання НКС формы культурна-адукацыйнай работы музеяў.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны для фарміравання дзяржаўнай культурнай палітыкі ў галіне НКС, распрацоўкі адпаведных метадычных рэкамендацый. Факталагічны матэрыял можа быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы навучальных дапаможнікаў, агульных лекцыйных і спецыяльных курсаў для вышэйшых навучальных устаноў. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны айчыннымі музеямі пры рэалізацыі праектаў па дакументаванні НКС, ажыццяўленні навукова-даследчых праграм, пры абнаўленні існуючых і стварэнні новых музейных экспазіцый, выставак. Атрыманыя вынікі могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы музейна-педагагічных праграм, накіраваных на захаванне НКС, а таксама іншых культурна-адукацыйных праектаў у сферы нематэрыяльнай спадчыны.

**Сферы ўжывання**: тэорыя і гісторыя культуры, музеязнаўства, ахова гісторыка-культурнай спадчыны, этналогія, педагогіка, гісторыя Беларусі.

# РЕЗЮМЕ

## Филипчик Денис Владимирович

## Нематериальное культурное наследие в государственных музеях Республики Беларусь (1991–2016 гг.)

**Ключевые слова**: нематериальное культурное наследие, музейное документирование, научно-исследовательская работа, экспозиционно-выставочное пространство, культурно-образовательная деятельность.

**Цель исследования**: выявить сущность и содержание деятельности государственных музеев Республики Беларусь по документированию, изучению, интерпретации нематериального культурного наследия в 1991–2016 гг.

**Методы исследования:** общенаучные: анализ, синтез, индукция, дедукция, сравнение, обобщение; специально-исторические: историко-генетический, историко-системный, компаративный; количественный анализ, семиотический метод, анкетирование.

**Полученные результаты и их новизна:** в диссертации впервые определены особенности музейного документирования НКС, выделены этапы в музейном изучении НКС, показана значимость научно-исследовательской деятельности музеев для сохранения НКС. Определены тенденции представления НКС в экспозиционно-выставочном пространстве. Выделен метод построения экспозиции, который позволяет отображать все области нематериального наследия. В диссертационном исследовании выделены наиболее эффективные с точки зрения сохранения НКС формы культурно-образовательной работы музеев.

**Рекомендации по использованию:** материалы исследования могут быть использованы для формирования государственной культурной политики в области НКС, разработки соответствующих методических рекомендаций. Фактологический материал может быть использован при подготовке учебных пособий, общих лекционных и специальных курсов для высших учебных заведений. Результаты исследования могут быть использованы отечественными музеями при реализации проектов по документированию НКС, осуществлении научно-исследовательских программ, при обновлении существующих и создании новых музейных экспозиций, выставок. Полученные результаты могут быть использованы при разработке музейно-педагогических программ, направленных на сохранение НКС, а также других культурно-образовательных проектов в сфере нематериального наследия.

**Сферы применения:** теория и история культуры, музееведения, охрана историко-культурного наследия, этнология, педагогика, история Беларуси.

**ABSTRACT**

**Dzianis Uladzimiravich Filipchyk**

**Intangible Cultural Heritage at State Museums of the Republic of Belarus (1991–2016)**

**Key words:** intangible cultural heritage, museum records, scientific research, exposition space, cultural and educational activity.

**Research purpose:** to find out the essence and substance of Belarusian state museums' activities on documenting, researching and interpreting intangible cultural heritage in 1991–2016.

**Research methods:** general scientific: analysis, synthesis, induction, deduction, comparison, generalization; special historical: historical and genetic, historical and endemic, comparative; quantitative assay, semiological analysis, questionnaire survey.

**Results and scientific novelty:** the thesis for the first time specifies the aspects of museum intangible cultural heritage records, allocates stages of the intangible cultural heritage museum research, emphasizes the significance of museum research activities for preserving intangible cultural heritage. Intangible cultural heritage representation tendencies at exposition space are noted. An exposition formation method, which allows to introduce all the aspects of intangible cultural heritage, is given prominence. The thesis research highlights the most effective forms of the museums' cultural and educational work from the intangible cultural heritage preserving point of view.

**Recommendations for use:** materials of the research can be used for developing state cultural policy on intangible cultural heritage, for elaborating respective methodology recommendations. The fact-based material can be used when preparing educational textbooks, general and special lecture courses for higher education institutions. The results of the research can be used by Belarusian museums when implementing intangible cultural heritage recording projects, fulfilling scientific research programs, renewing existing museum expositions and creating new ones. The results attained can be used for developing museum educational programs, aimed at intangible cultural heritage preserving, and other cultural and educational projects in the field of intangible heritage.

**Field of application:** theory and history of culture, museum studies, historical and cultural heritage preserving, ethnology, pedagogy, history of Belarus.